Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

# ГАСЦІНЕЦ

Ня бойся!

№ 1 (76), СТУДЗЕНЬ 2009 ГОДА

**Цытата нумара:**

**Дай палітыку свабоду рук, і ты знойдзеш іх у сваіх кішэнях.**

**Эдвард Макензі**

# ЦІ ДОЙДЗЕМ ДА ГАЛОСНАСЦІ?

У часы перабудовы пытанне галоснасці, адкрытасці ўлады было адным з найважнейшых. Менавіта адкрыццё закрытых пратаколаў КПСС, знаёмства грамадства з творамі Салжаніцына, інфармаванне аб спецльготах высокай наменклатуры выклікалі ў адукаванай часткі грамадства змену адносін да камуністычнага рэжыму.

З таго часу прайшло больш дваццаці гадоў, свет навокал непазнавальна змяніўся, нормы свабоды слова сталі неад'емнай часткай жыцця ва ўсіх краінах Усходняй Еўропы, Балтыі, Украіны. Але праблема свабоды слова, адкрытасці ўлады застаецца актуальнай для Беларусі. Нягледзячы на дэкларуемыя нормы свабоды слова мясцовыя ўлады Беларусі амаль ва ўсіх рэгіёнах краіны адмаўляюць грамадзянам у правядзенні сходаў, пікетаў, мітынгаў. Пры гэтым па іезуіцкі адводзячы грамадзянам месцы масавых мітынгаў на месцах выгулу сабак, на лясных ускрайках гарадоў і г.д.

Не з'яўляецца ў гэтым спісе выключэннем і ўлады Гарадоцкага раёна. Мясцовыя актывісты яшчэ не атрымалі ніводнага дазволу на правядзенне мерапрыемтсва ў рысе горада. Адзінае на што пайшлі ўлады – вызначалі месцам пікетаў і г.д. лес Вараб'ёвы горы ды магчымасць маніфестацыі па Сабалеўскай вуліцы, быццам калісьці там праходзяць падобныя мерапрыемствы ўладаў. Вось такія двайныя стандарты: для ўлады – плошча Леніна, а для апанентаў – лес за горадам. Пытайцеся дазволу ў Анатоля Мікалаевіча на мітынгаванне ў лесе.

Сабрацца жа для абмеркавання пытанняў жыцця і шляхоў пераадолення крызісу у райвыканкаме кіраўніцтва не дазваляе. Застаецца тады праз газету папрасіць ва ўлады адказа на наступныя пытанні:

1. Чаму ў Гарадку зачыняюцца прадпрыемствы, а іх абсталяванне знікае, як на харчовым камбінаце, рамзаводзе?
2. Чаму з сярэдзіны 90-х гадоў ніяк не выконваецца рашэнне СМ РБ аб стварэнні ў Гарадку Цэнтра зімовых відаў спорту, а адзіная гасцініца Гарадка "Раўбічы" ўжо зачынена другі год?
3. Чаму ў раёне знікаюць цэнтры былых гаспадарак разам са школамі: Обаль, Газьба, Хвошна, Мехавое..?
4. Чаму выбаршчыкі не ведаюць за якія грошы набываецца новы джып для старшыні райвыканкама, а ў школах раёна катастрафічна не хапае спартыўнага інвентара?
5. Чаму "вылізваецца" цэнтр Гарадка, а ў прыватных гадамі вуліцы горада патанаюць у брудзе, як вул. Міра 1-3, Казлова, Сонечная і іншыя?

Рэдакцыя газеты размесціць змястоўны адказ старшыні райвыканкама для ўвагі сваіх чытачоў. Запрашаем мясцовую уладу рухацца ў накірунку галоснасці. Гэта ў інтарэсах усяго грамадства.

**Леанід Гаравы.**

# Інфармацыйны ліст "Да еўрапейскай інтэграцыі"

Падрыхтаваны і распаўсюджаны актывістамі Руху "За Свабоду!" на тэрыторыі Гарадоцкага, Віцебскага, Бешанковіцкага і Шумілінскага раёнаў

Інфармацыйны ліст выпушчаны ў форме ўлёткі фармата А4 і ўтрымлівае матэрыял аб еўрапейскай інтэграцыі. Грамадзяне рэгіёна маюць магчымасць даведацца аб асноўных палажэннях праекта Еўракамісіі "Усходняе партнёрства", якія прапанаваны і Беларусі, у матэрыяле "Рука партнёрства протянута".

Рэдакцыйны матэрыял "Еўропа чакае Беларусь" апавядае аб кроках Еўразвяза насустрач Беларусі і заклікае грамадзян патрабаваць ад уладаў крокаў насустрач Еўропе. У інфармацыйным лісце таксама ўтрымліваецца матэрыял аб гісторыі еўрапейскай інтэграцыі: "Каляндар еўрапейскай інтэграцыі", "Десять заповедей Европейского Союза", "Европейские ценности".

Матэрыял падрыхтаваны актывістам Руху "За Свабоду!" Леанідам Гаравым, які прайшоў курсы паслядыпломнай адукацыі па асновах публічнай адміністрацыі і еўрапейскай інтэграцыі ў Вышэйшай школе адміністрацыі публічнай г. Беластоку (Польшча).

# АДМОЎЛЕНА З БЛЫТАНІНАЙ МЕСЯЦАЎ

Леанід Аўтухоў, старшыня Гарадоцкай суполкі Партыі БНФ, актывіст Руху "За Свабоду!" атрымаў адказ з Гарадоцкага райвыканкама ад намесніка старшыні Буруновай Надзеі аб забароне на правядзенне сходу выбаршчыкаў 9 снежня (!!!) 2009 году. Пры гэтым спадар Аўтухоў звяртаўся з заявай аб правядзенні сходу 9 студзеня 2009 г ў вялікай зале Гарадоцкага райвыканкама.

На сёння цяжка сказаць, што паўплывала на намесніцу старшыні Гарадоцкага райвыканкама Надзею Бурунову даць неадэкватны адказ – няведанне беларускай мовы ці палітычная замова. А магчыма спалучэнне гэтых двух прычын.

Пад час выбарчай кампаніі ў Палату прадстаўнікоў кандыдат у дэпутаты Леанід Аўтухоў ужо звяртаўся да старшыні Гарадоцкага райвыканкама Анатоля Мароза з заявай аб невыкананні супрацоўнікамі Гарадоцкага райвыканкама патрабаванняў Закона "Аб мовах у РБ" аб неабходнасці ведання дзяржаўнай беларускай мовы. І вось чарговы адказ з райвыканкама яскрава падцвярджае, што з веданнем дзяржаўнай беларускай мовы ў намесніцы старшыні райвыканкама Надзеі Буруновай існуюць пэўныя праблемы.

> Райвыканкам прапануе праводзіць сход выбаршчыкаў у лесе, не даючы згоды на масавыя мерапрыемства для выбаршчыкаў Гарадка аж на 9 снежня 2009 году.

Як зараз трэба ацэньваць афіцыйны ліст з Гарадоцкага райвыканкама? Як дазвол на правядзенне сходу 9 студзеня і забарону на 9 снежня? Або як ігнараванне Гарадоцкім райвыканкамам канстытуцыйных правоў і свабодаў грамадзян на правядзенне масавых мерапрыемстваў, бо толькі нецывілізаваная ўлада можа выпрабляць пастановы на правядзенне мерапрыемстваў у лесе.

Вось і атрымліваецца: Лукашэнка дае громкія інтэрв'ю заходнім СМІ аб прагрэсе ў галіне правоў і свабод грамадзян, а ўлады на месцах гэтыя правы і свабоды ўціскаюць. Дадзены адказ спадар Аўтухоў абскардзіў перад старшынёй Віцебскага аблвыканкама.

P.S. Пасля з'яўлення дадзенага матэрыяла на сайце http://haradok.belarda.org Гарадоцкі райвыканкам даслаў прабачэнне Леаніду Аўтухову за дапушчаныя памылкі.

**Вынікі апытання на http://haradok.belarda.org: Ці прынясе карысць крэдыт МВФ?**

| | |
|---|---|
| Абавязкова | 25,0% |
| Хутчэй так, чым не | 25,0% |
| Не прынясе | 41,7% |
| Не думаў | 8,3% |

# Неякасны рамонт для дзетак

Пра гэта напісала вучаніца Межанскай школы ў рэдакцыю газеты "Гарадоцкі веснік". У сваім лісце вучаніца выклала праблемы, якія ўзніклі пасля неякаснага рамонту, які доўжыўся ў школе з мая па кастрычнік 2008 году. Па выніках "рамонту" так і не заменена сантэхніка на паверхах, няма асвятлення ў актавым зале, цячэ быццам бы перакрыты дах, ў цвілі спрэс вокны з ПВХ, у расколінах сцены. Пры гэтым цвіль не толькі на вокнах, але і ў кабінетах, спартовым зале.

Дадзенае становішча тым больш недаравальна, што з першага верасня пры школе дзейнічае дзіцячы садок з дзеткамі ад двух гадкоў да пяці. Напрыканцы ліста выпускніца просіць, каб былі прыняты хаця бы якія небудзь меры дарослымі дзядзечкамі ад улады, каб школа была адрамантавана на справе, а не ў справаздачах заказчыкаў рамонту.

Гэта першы сур'ёзны крытычні ліст, які пабачылі чытачы раёнцы за апошнія гады. Ліст у якім пастаўлены праблемы, кранаючы інтарэсы жыхароў Межанскага краю. Бо зараз у Межанской школе навучаюцца дзеткі з зачыненых за апошнія гады школ краю: Газьбінскай, Хмяльніцкай, Палоўскай.

Трэ адзначыць, што падобныя праблемы існуюць не толькі ў Межанскай школе. Адзін з чытачоў, што пазваніў у рэдакцыю "Гасцінца" з Бычыхі, паведаміў, што спортзал Бычыхінскай школы таксама да канца не адрамантаваны – ёсць праблемы з вокнамі, падлогай, асвятленнем, таксама ў ім амаль няма неабходнага спартыўнага абсталявання – лыж, спартовых мячэй і г.д. Дадзенае становішча ў школах ніяк не дае падстаў для ўзнагароджання кіраўніка адукацыі ў раёне, як гэта было ў мінулым годзе. Хутчэй наадварот.

**Л. Антонаў.**

## І такое бывае

"Хачу жыць у Беларусі, якую паказвае БТ!" Гэта класічная фраза пра розніцу паміж тэлевізійным і рэальным жыццём у краіне адчуў спаўна адзін з вядучых кіраўнікоў Віцебскага аблвыканкама, што наведаў Гарадоцкі раён зусім нядаўна.

Аб'ектам наведвання была адна з будоўляў раёна ў Мяжы. На гэтым аб'екце кіраўнік, мусіць, упершыню ўбачыў карціну, якую амаль ніколі не паказвае БТ. На будоўлі простыя рабочыя, як кажуць ужо амаль лыка не вязалі. Пры гэтым адзін з іх не ўтрымаўся на нагах і зваліўся на зямлю для адпачынку. З вялікай цяжкасцю абласны госць знайшоў некалькі цвярозых супрацоўнікаў.

Аднachасова з гэтым служба аховы госця за дзве няпоўныя гадзіны знаходжання ў мястэчку спыніла трох нецвярозых кіроўцаў. Вось і ўся барацьба з п'янствам!!! Нашы людзі па-ранейшаму любяць ездзіць у алкагольным тумане.

Пасля такога візіта бледны выгляд быў ва ўсіх адказных райвыканкамаўскіх супрацоўнікаў. Мусіць па выніках гэтай паездкі ў вобласці праведзена нарада аб павышэнні ролі мясцовых органаў улады па прафілактыцы п'янства, злачыннасці. А ці будуць пасля гэтага арганізацыйныя вывады – цікавае пытанне.

**Дзядзька Васілек.**

## АБ'ЯВА

***Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Гасцінец" паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бясплатную падпіску.***

***Рэдакцыя абвяшчае конкурс чытачоў "І такое бывае!". Удзельнікаў Рэдакцыя паведамляе, што конкурс чытачоў "І такое бывае!" працягваецца. Удзельнікаў конкурсу чакаюць прызы, а пераможцу -- сюрпрыз! Матэрыялы дасылайце на адрас рэдакцыі. Матэрыялы магчыма дасылаць да 1 сакавіка. Вынікі конкурсу будуць палдведзены да 8 сакавіка.***

***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Гасцінец".***

# ХРОНИЧЕСКИ БОЛЬНЫЕ ПАТОЛОГИЧЕСКОЙ ЖАДНОСТЬЮ

Светлана Калинкина



Каждый день иду на работу мимо строящегося нового корпуса лечкомиссии и ломаю голову: ну, что ж они у нас такие больные?

Когда-то и ЦК, и Совмин, и всякие заслуженные деятели умещались на лечении в нескольких корпусах «лечкомисии», и при этом все считали, что страной правят немощные престарелые номенклатурщики. Лечкомисия была бельмом на глазу, материализованным воплощением привилегий, которыми наделила себя тогдашняя верхушка. Именно на волне борьбы с привилегиями пришла к валсти молодая команда, да вот странность - так расхворались «молодые волки», что к уже имеющимся корпусам лечкомиссии им понадобилось и здание детской поликлиники, и помещения Института радиационной медицины. Теперь вот еще строят два огромных новых корпуса. Причем, строят на зиму глядя, в период острого финансового кризиса. Все социальные программы, с которыми можно повременить, урезаны, но ничто не помешало чиновникам затеять мегастроительство больницы для самих себя.

А ведь если подумать, то получается какой-то абсурд! То они все повально в хоккей играют и по президентскому свистку на лыжах кроссы шпарят, то в клиниках своих уместиться не могут... Или они прямо с кросса - к врачам бегут?! Так, господа, для государства эти ваши тараканьи бега слишком дорогим развлечением оборачиваются. И налогоплательщикам не нужны такие жертвы.

Как я понимаю: больные - лечитесь и не занимайте высокооплачиваемые места. И лучше лечитесь в обычных городских больницах. Почему вообще армии чиновников требуются отдельные клиники? У них что, болезни не как у людей? Им что, клизму обязательно ставить в апартаментах, отделанных карельской березой?..

Как-то я подъезжала на работу на такси. Грустный дядечка-водитель, печально посмотрев на «ВИП-больницу», вздохнул и произнес: «А я своего сына не смог сюда на лечение пристроить. Умер сын. В 26 лет. И у нас женой больше детей нет, он один у нас был, наша гордость, офицер».

И рассказал мне водитель грустную историю про то, как его сын-офицер подхватил на учениях в Доманово ангину, как лечили его врачи в полевой палатке, потом доставили в военный госпиталь, пока тянули с госпитализацией - ангина дала осложнение на сердце, парень умер. И вот уже несколько лет мой случайный знакомый ходит по кабинетам и пытается добиться выплаты страховки за сына, поскольку все офицеры у нас, как известно, застрахованы, и в случае их смерти «при исполнении» государство, вроде бы, гарантирует немалые выплаты их семьям. Но не дают этих денег несчастным родителям. Говорят, что не связана ангина и осложнения от нее с исполнением офицером своих обязанностей. Ну, нет ангины в списке «профессиональных офицерских заболеваний». (А какие, интересно, есть?) И куда только этот человек ни писал, к кому ни обращался - бесполезно. Хотя любому здравомыслящему человеку понятно, что если офицер заболел на учениях, значит, получил заболевание при исполнении служебных обязанностей. То есть государство за его смерть должно выплатить то, что обязалось выплатить по закону. Но другая логика у чиновников -- им просто жалко денег.

На выплате денег родителям, которые потеряли единственного сына, они экономят. Зато на обслуживание самих себя чиновникам не жалко ничего. Строится сразу несколько новых корпусов «лечкомиссии», депутаты «скромно» увеличили бюджет на собственное содержание, новоиспеченный губернатор Александр Косинец не успел вступить в должность, а уже озаботился квартирным вопросом и лично ездит контролировать строительство собственных апартаментов. И я никак не пойму: а где квартира Косинца, в которой он жил в том же Витебске до переезда в Минск? А где квартира бывшего губернатора Владимира Андрейченко? В конце концов, зачем губернатору Косинцу квартира, если еще неизвестно, сколько он продержится на своем посту, тем более, что есть шикарная государственная дача?.. Кризис ведь! Ежедневно представители власти призывают людей затянуть пояса, экономить каждую копейку, но сами не затягивают, на себе не экономят, пируют во время чумы на любительских хоккейных турнирах.

Что ж им все мало? Что ж они у нас такие жадные? Что ж они, повылазив из деревень, все нахвататься не могут? Это действительно болезнь. Правда, даже в лечкомиссии она не лечится.

# РАСІЯ ДЗЕЙНІЧАЕ ЦЫНІЧНА І ЖОРСТКА

**Кіраўнік аналітычнага цэнтру EcooM Сяргей Мусіенка заклікае зрабіць сур'ёзныя высновы з газавага канфлікту Расіі і Ўкраіны. Ён вінаваціць урад у тарпедаванні праекту энергетычнага маста Ўкраіна Беларусь Літва.**

Беларусь абавязана зрабіць сур'ёзныя высновы з газавага канфлікту Расіі і Ўкраіны, заявіў кіраўнік аналітычнага цэнтру EcooM Сяргей Мусіенка. Ацэнкі Мусіенкі распаўсюдзіла лукашэнкаўскае агенцтва «Інтэрфакс Захад».

Галоўнай прычынай канфлікту ёсць імкненне Масквы пераканаць Захад у патрэбе пабудовы газаправоду «Nord Stream» і заадно вырашыць іншыя «тактычныя» пытанні, мяркуе ён.

На думку С.Мусіенкі, праблема вырашаецца Расіяй «з дапамогай сілавога ціску, цынічнага й жорсткага». Дзеянні расійскага боку скіраваны на тое, каб збунтаваць грамадскую думку ў Еўропе, але Расія робіць сабе мядзведжую паслугу, бо ў Еўропе бачаць кругляў.

Кіраўнік EcooM назваў дзеянні «Газпрому» «спланаванай акцыяй па прымусе краінаў ЕС дазволіць пракладку трубы па дне Балтыйскага мора».

Ён крытыкуе ідэю «Норд Стрыму»

С.Мусіенка не выключае паўтору газавага канфлікту, толькі ўжо з Беларуссю. «Мы сутыкнёмся з такім сама жорсткім прэсінгам», — прагназуе ён. «Узнікае толькі пытанне: ці будуць нас спрабаваць так бараніць у Еўропе, як Украіну?» – задаецца пытаннем ён.

Мусіенка лічыць, што «Беларусі трэба рабіць сур'ёзныя высновы і дзейнічаць вельмі хутка; тыя, у каго складанасці з сумленнем, думаюць зусім іншымі катэгорыямі: рубільнік і вентыль».

Мусіенка лічыць патрэбным змяншэнне спажывання газу і «рэальныя праекты па альтэрнатыўнай энергетыцы, а не міфічныя энергазберагальныя тэхналогіі, якія толькі ствараюць карупцыйныя схемы».

Таксама Мусіенка ў жорсткіх выразах звяртае ўвагу на «сарваны ўрадам Беларусі праект па транзіце і куплі за беларускія рублі ўкраінскай электраэнергіі».

Для таго, каб запусціць энергамост з Украінай, няма ніякіх тэхнічных перашкодаў, кажа ён і дадае: у дадзеным праекце вельмі зацікаўленая і Літва. З ягоных словаў, Украіна, маючы лішкі электраэнергіі, можа пастаўляць яе столькі, колькі трэба.

«Вось дзе трэба знаходзіць інвестыцыі, а не ездзіць безвынікова ў Лондан [«Інтэрфакс» у дужках тлумачыць для неразумных — на інвестыцыйны форум] і плаціць за тое расейскай кансалтынгавай фірме», — недвухсэнсоўна кідае Мусіенка абвінавачванні на адрас Сідорскага. У лукашэнкаўскіх СМІ крытыка амаль ніколі не бывае выпадковай.

Мусіенка працягвае: «Узнікае пытанне: чаму блакуюцца эканамічна выгадныя праекты?

Мова ідзе пра нейкая карупцыйныя схемы, лабіраванне чыіхсьці інтарэсаў, але ж гэта не проста недальнабачнасць беларускага ўраду?», — рытарычна пытаецца ён.

«Партнёры ў Еўрасаюзе пакуль бачаць, што беларусы не могуць вырашыць пытанне, якое нічога для нас не каштуе, а прынесла б істотны даход», — падсумоўвае С.Мусіенка і стварается ўражанне, што ягоным голасам гаворыць сп. Макей.

Сяргей Мусіенка – аналітык, блізкі да Адміністрацыі прэзідэнта. Ён стаў вядомы сваімі «экзіт поламі», якія дакладна прагназавалі вынік, што пазней абвяшчаўся Лідзіяй Ярмошынай. Прычым лічбы абвяшчаліся самым ранкам у дзень галасавання.

Крытыка Мусіенкам ураду можа азначаць жаданне групы Віктара Лукашэнкі ўвесці чыноўнікаў малодшага пакалення таксама на шэраг пасадаў у Саўміне.

А заадно спісаць на Сідорскага віну за эканамічны крызіс.

# КРЕКС-ПЕКС-ФЕКС!

**Александр Класковский**

Короче, несите ваши денежки (так и слышится хриплый голос кота Базилио:) на рублевые депозиты. А потом — подарок под елочку в виде 20-процентной с хвостиком девальвации.

Многие сразу протрезвели и, забыв про недоеденный (-ое?) оливье, ломанулись скупать плазменные телевизоры, стиральные машины и прочий, говоря чиновничьим новоязом, сложнобытовой товар. Но ведь не наелся — не належишься.

Рептильные госСМИ в первые дни вообще тупо молчали (есть такая сочная белорусская присказка: «мову адняло»). Точнее, сделали топ-новостью ледовую забаву с участием сами-знаете-кого. Ударим турниром по финансово-экономическому бездорожью!

Кто-то чешет репу, словно вчера родился. А ведь если разобраться, эта власть по жизни занималась «кидаловом».

Типичным кидаловом оказался проект союзного государства. Слава богу, конечно, что независимость чудом уцелела. Но, согласитесь, с точки зрения прозревшего наконец российского политического бомонда это была банальная «разводка на бабки». По типу: вот завтра сольемся в экстазе, так не будьте жлобами, дайте газу подешевле!

Однако независимость шаткая. Беларусь сильно увязла. Экономист Леонид Заико пророчит после девальвации полную капитуляцию: только и останется, мол, положить финансовую систему под российский рубль.

Посмотрим теперь на внутренние политические дела. По данным социологов НИСЭПИ, в сентябре 2007 года, перед парламентскими выборами, 41,8% наших граждан (я бы набросил еще процентов 12-15 на коэффициент страха) высказали мнение, что «будет лишь имитация борьбы, а распределение мест заранее определено властями».

Но при этом многие традиционно смотрят на электоральные фокусы сквозь пальцы: чарку и шкварку ведь власть худо-бедно обеспечивает.

Теперь вот и «худо», и «бедно», похоже, обретают прямой смысл. Ресурс истощился, и «кидалово» закономерно перешло в социально-экономическую сферу. Едва проглотили пилюлю отмены льгот, как — оба-на! — девальвация под новогодние петарды. У людей элегантно вынули из кошельков по 20%.

Белорусские начальники, как всегда, нашли соринку в чужом глазу. Мол, наша модель офигенно классная, но вот мировой кризис всю малину испортил. А причина кризиса — коррупция на гнилом Западе.

Позвольте наивный такой вопрос: а в чем, собственно, достоинство «белорусской модели»? Не дали разворовать родину? Не надо ля-ля!

Все эти годы экономика была банально придавлена начальственной задницей — вот вам и вся модель. «Еще раз предупреждаю: оставьте руководителей предприятий в покое!» — вбивает ныне главный начальник в головы обученной как раз наоборот вертикали. Насаждение хозяйственной парадигмы á la kolkhoze сопровождалось деспотичным зажимом гражданских свобод. Пока Россия была щедрой душой, эта убогая модель еще работала. Когда идет халява, большого ума не надо.

Помните трели про «европейского тигра»? Сегодня оказалось, что страна элементарно жила не по средствам. И закономерно оказалась у разбитого корыта. В корыте: дикий минус внешней торговли, нарастающий дефицит счета текущих операций платежного баланса, под 15 миллиардов внешнего долга (не знали? так вот знайте!), практически не тронутая реформами, по сути, нерыночная экономика.

Деятели, которые еще недавно клялись, что никакого обвала не будет, 1 января обвалили рубль так, что выпал в осадок даже видавший виды профессор Богданкевич: «…Я не ожидал, что наши власти будут так обманывать свой народ».

И это, кажется, лишь цветочки. Экономисты прогнозируют скачок инфляции — возможно, на 15-20% только за первый квартал. Уже на 15% выросла коммуналка. А ведь обещали не более чем на пять долларов в год!

Власть уже не в силах выполнять социальный контракт. Тот самый, в обмен на который обыватель без особых колебаний принял систему политического кидалова. Простой человек прагматично решил: в политике пусть дурят, черт с ними, демократию на хлеб не намажешь. Главное, чтобы пайку без обмана давали.

Но так не бывает.

До поры до времени простая публика блаженствовала. «Мы ленивы и нелюбопытны», как говаривал классик. Зачем напрягаться, упираться рогом, пытаться глянуть дальше своего носа, если и так — сыт, пьян, и этот самый нос в табаке. Более продвинутую часть социума власть и «лихторат», по сути, взяли в заложники.

Давно ли задорно лаяли на Запад, и особенно на Америку? Выгоняли послов и все такое. Мы, мол, маленькая, но гордая республика, и неча нам тут указывать! Гоу хоум к чертовой бабушке!.. И куда девалась гордость, когда бухнулись в ножки дяде Сэму, выпрашивая кредит в пять миллиардов вражьих баксов?

Временный триумф отстоя, серости и мракобесия, лузерская надежда на ремейк совка — сейчас вылезают боком.

Еще аукнется многое. Например, дремучая антиреформа образования, ориентированная на массовый выпуск фабзайцев в эпоху информационного общества. Вместо того чтобы оттачивать интеллект нации, сверхзадачей определили умение точить гайки. Спору нет, и это надо, но где элементарное чувство времени?

И вот пробил час, когда надо расплачиваться за Эпоху рептильного мозга.

Поле чудес становится все более похожим на помойку.

**Заснавальнік і рэдактар:**
Леанід Гаравы

**Адрас рэдакцыі:** 211573, г. Гарадок,
вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: haravy@tut.by
Тэл. 8-02139-4-42-52, маб. + 375296723842 (V),
+375298147766 (МТС)

**Наклад: 290 асобнікаў.**
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна